# § 29. Геаграфія лясной і рыбнай гаспадаркі

*Узгадваем. Якія тыпы лясоў характэрныя для Беларусі? Якая лясістасць у Беларусі?*

**Структура і роля лясной гаспадаркі ў эканоміцы краіны.** Лясная гаспадарка ўключае лесаводства, лесанарыхтоўкі, збор дзікарослых і нядрэвавых лесапрадуктаў. *Лесаводства* займаецца вырошчваннем лесу. У 2010–2017 гг. лесаразвядзенне мае тэндэнцыю да павелічэння і штогод адбываецца на плошчы каля 33,5 тыс. га. Найбольш высокія паказчыкі лесаразвядзення ў Гомельскай і Віцебскай абласцях. Зараз запасы драўніны ў лясах Беларусі складаюць 1,8 млрд м$^3$. Гэта больш, чым у большасці краін Еўропы. Найбольшыя запасы драўніны адзначаны на тэрыторыі Гомельскай, Мінскай і Віцебскай абласцей, найменшыя — у Брэсцкай і Гродзенскай.

*Лесанарыхтоўкі* займаюць першае месца ў лясной гаспадарцы па аб'ёме вытворчасці і колькасці працаўнікоў (мал. 114). Асаблівасцю структуры сыравінных запасаў драўніны ў Беларусі з'яўляецца перавага прамыслова-каштоўных парод. Асноўная доля насаджэнняў прыходзіцца на хвойныя пароды (хвоя і елка), затым ідуць мяккалістыя пароды — бяроза, асіна. Прадпрыемствы па лесанарыхтоўках маюцца ва ўсіх абласцях. Больш за ўсё іх у Віцебскай, Гомельскай і Мінскай абласцях, якія даюць амаль 3/4 усёй драўніны. Нарыхтоўкі драўніны вядуцца ў буйных лясных масівах лясгасамі і леспрамгасамі. Менш прадпрыемстваў у Гродзенскай вобласці, але і тут у басейне Нёмана ёсць даволі буйныя масівы лясоў і, адпаведна, вялікія аб'ёмы лесанарыхтовак. Асноўным прадпрыемствам у краіне па нарыхтоўцы драўніны з'яўляецца канцэрн «Беллеспаперапрам». Плошчы высечак у 2010–2017 гг. нязначна скараціліся і склалі каля 506 тыс. га у год. Лідзіруючае становішча займае Мінская вобласць — больш за 120 тыс. га у год.



Мал. 114. Лесанарыхтоўка

Лесанарыхтоўка драўніны ў цяперашні час штогод павялічваецца і складае крыху больш за 19 млн м$^3$ ліквіднай драўніны.

Штогод леспрамгас і лясгасы нарыхтоўваюць менш за 10 млн м$^3$ дзелавой драўніны. Гэтай колькасці для патрэбаў краіны не хапае, таму Беларусь з Расіі завозіць каля 1 млн м$^3$ драўніны. Чаму ў Беларусі нарыхтоўваецца драўніны менш, чым неабходна для спажывання?

*Збор дзікарослых і нядрэвавых лесапрадуктаў* ажыццяўляецца ў розных краінах для прамысловых, лячэбных, аздараўленчых і іншых мэт. *Якія дзікарослыя лесапрадукты нарыхтоўваюцца ў Беларусі?*

**Геаграфія паляўнічых угоддзяў краіны.** Доўгі час паляванне на дзікага звера і птушку было асноўнай крыніцай існавання людзей. З прычыны гэтага колькасць жывёл паслядоўна скарачалася. *Якія жывёлы былі вынішчаны на тэрыторыі Беларусі?* Вядзенне паляўнічай гаспадаркі ў Беларусі сёння — гэта напрамак дзейнасці, які перспектыўна развіваецца. *Якія віды жывёл адносяцца да рэсурсных і маюць прамысловае значэнне?* Плошча паляўнічых угоддзяў краіны складае каля 16 млн га, лясных паляўнічых угоддзяў — 44 %, палявых — 49 %, водна-балотных — 6 %. Практычна ў кожным раёне маюцца паляўнічыя гаспадаркі. Для рэгулявання колькасці прамысловых відаў жывёл вызначаюцца аптымальныя тэрміны палявання, арганізавана падкормка дзікіх жывёл у зімовы час. Для атрымання каштоўнага футра ў Беларусі функцыянуе некалькі звера-гадоўчых гаспадарак.

**Геаграфія рыбалоўства і рыбаводства.** У рыбнай гаспадарцы выкарыстоўваецца каля 600 прыродных (азёры, рэкі) і штучных (вадасховішчы і сажалкі) вадацёкаў і вадаёмаў. *Назавіце буйнейшыя азёры краіны.* У азёрах жыве каля 30 відаў прамысловых рыб, але аснову промыслу складаюць лешч, судак, плотка, шчупак, акунь, сазан, сярэбраны карась, лінь. Найбольш буйныя рыбапрадуктыўныя азёры — Нарач, група Браслаўскіх і Ушацкіх азёр.

Пераважна на базе вадасховішчаў і азёр рыбалоўствам і развядзеннем рыб займаюцца рыбгасы. У цяперашні час у Беларусі налічваецца 16 рыбгасаў, 8 рыбагадавальнікаў, створаны рыбныя сажалкі шэрага сельскагаспадарчых прадпрыемстваў і дапаможных гаспадарак прамысловых прадпрыемстваў (мал. 115). Рыбгасы размешчаны ў асноўным у Брэсцкай і Мінскай абласцях, рыбагадавальнікі — у Віцебскай. Тут разводзяць карпа, белага амура, таўсталобіка, карася, сома, фарэль, сцерлядзь.


Мал. 115. Рыбгас «Волма»

**Абагульнім і запомнім.** Галоўным прадпрыемствам у Беларусі па нарыхтоўцы драўніны з'яўляецца канцэрн «Беллеспаперапрам».
Паляўнічыя гаспадаркі маюцца практычна ў кожным адміністрацыйным раёне. У рыбнай гаспадарцы выкарыстоўваецца каля 600 вадаёмаў і вадацёкаў краіны.

1. Якую ролю адыгрывае лясная гаспадарка ў эканоміцы Беларусі? 2. У чым асаблівасці лесанарыхтовак у краіне? 3. Чаму ў Беларусі атрымала развіццё рыбаводства?

4. Ці магчыма павелічэнне аб'ёму лесанарыхтовак у краіне? 5. Чаму паляўнічая гаспадарка ў Беларусі мае вялікія перспектывы? 6. Чаму на поўдні Беларусі мала азёр прамысловага значэння?

***Ад тэорыі да практыкі.*** Складзіце картасхему «Геаграфія паляўнічых угоддзяў» для замежных турыстаў.

## § 30. Геаграфія прамысловасці. Горназдабыўная прамысловасць

***Узгадваем.*** *На якія віды падзяляюцца карысныя выкапні па ступені іх выкарыстання? Якія спосабы здабычы карысных выкапняў вы ведаеце?*

**Горназдабыўная прамысловасць** уключае прадпрыемствы па здабычы розных карысных выкапняў (мал. 116). Доля горназдабыўной прамысловасці ў аб'ёме прамысловай вытворчасці ўсяго 1,3 %. Усе прадпрыемствы галіны размешчаны каля крыніц сыравіны. Найбольшая ўдзельная вага ў горназдабыўной прамысловасці сярод рэгіёнаў прыходзіцца на Гомельскую вобласць (63 %). *Чаму менавіта Гомельская вобласць лідзіруе ў рэгіянальнай структуры галіны?* Больш за 10 % складае доля Брэсцкай і Мінскай абласцей.

Горназдабыўная прамысловасць Беларусі
- Здабыча нафты і спадарожнага газу
- Здабыча торфу
- Здабыча карысных выкапняў для хімічнай прамысловасці (калійных солей, сапрапелю і інш.)
- Здабыча каменнай солі
- Здабыча карысных выкапняў для вытворчасці будаўнічых матэрыялаў (будаўнічага каменю, даламіту, мелу і мергелю, пяску і гліны, пясчана-жвіровага матэрыялу)

Мал. 116. Структурная схема горназдабыўной прамысловасці Беларусі

**Здабыча нафты і спадарожнага газу.** У 1964 г. у Беларусі было адкрыта Рэчыцкае радовішча, якое эксплуатуецца і сёння. Штогод здабываецца 1,6–1,7 млн т нафты. У цяперашні час распрацоўваецца каля 60 радовішчаў нафты. У асноўным нафта здабываецца ў Гомельскай вобласці. *Назавіце найбуйнейшыя радовішчы нафты ў Беларусі.* Два